*Ярослаb Р. Самуйлік*
*Брэст*

# Дыялектны ландшафт Выганаўскага Палесся

*The Dialectal Landscape of Vyhanaŭskaye Polesye*

The article considers the principal phonetic and morphological peculiarities of the Vyhanaŭskaye Polesye dialect units. The Vyhanaŭskaye Polesye is a small region in the zone of interdialectal contacts and mutual influences of the Brest-Pinsk Polesye dialects and those of the Paniamonnie (Upper Niemen region).

**Keywords:** Vyhanaŭskaye Polesye, phonetics, morphology, bundles of isoglosses, Hrodna-Baranavičy, North-Brest (Central-Telkhany subgroup), South-Telkhany, Vališča--Abrova, Middle-Zaharoddzie (Zagorodye) dialects, town of Telkhany patois, Telkhany dialectal zone

Выганаўскае Палессе – невялікі рэгіён, які размешчаны на ўзмежжы "тыповага" Заходняга Палесся і Панямоння, паміж рэкамі Ясельдай (прыток Прыпяці) і Шчарай (прыток Нёмана). У яго межах знаходзяцца азёры Выганашчанскае (26 км$^2$), Бабровіцкае (9,47 км$^2$) і інш. У гэтым рэгіёне праходзіць Агінскі канал, які злучае Ясельду са Шчарай, пабудаваны ў 1767–1783 гг. Адміністрацыйна – гэта ў асноўным паўднёвая частка Івацэвіцкага раёна (Целяханшчына, цэнтр – мястэчка Целяханы) і прылягаючыя тэрыторыі Ганцавіцкага і Пінскага раёнаў Брэсцкай вобласці.

У значнай колькасці навуковых прац Выганаўскае Палессе паказваецца як частка сумежжа паміж буйнымі дыялектнымі адзінкамі – гродзенска-баранавіцкай (панямонскай) і заходнепалескай (берасцейска-пінскай, загародскай) групамі гаворак [1, с. 402; 2, карта № 71; 3]. Акрамя таго, многія даследчыкі праводзяць паміж арэаламі названых гаворак старажытную балта-славянскую этнічную мяжу. У этнаграфічным аспекце гэтая тэрыторыя з'яўляецца месцам сутыкнення чатырох буйных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі: Паўночна-Заходняга, або Панямоння, Цэнтральнай Беларусі, Усходняга Палесся і Заходняга Палесся.

Пытанні дыялектнай сітуацыі на тэрыторыі Выганаўскага Палесся даследаваліся мала. Так, Н.Т. Вайтовіч выдзеліла паўночнабрэсцкія гаворкі, у склад якіх уключана і асноўная частка гаворак дадзенага рэгіёна [4, с. 81–82,

107–108, 113, 189; 5, с. 7–8, 38–39; 6, с. 202–203; 7, с. 87–90, 131]. Ф.Д. Клімчук удакладніў межы паўночнабрэсцкіх гаворак, адзначыў некаторыя асаблівасці, якія іх дыферэнцыруюць, а таксама на падставе фанетычных рыс вылучыў больш дробныя адзінкі – паўднёвацеляханскія і валішчанска-аброўскія гаворкі. Далей на поўдзень, паводле групоўкі даследчыка, размешчаны чатыры досыць адрозныя структурныя разнавіднасці заходнепалескіх, або загародскіх, гаворак – сярэдне-, паўночна-, паўднёвазагародскія і тараканскія гаворкі [5; 6, 204–214; 8].

З улікам гэтых фактаў, было вырашана даследаваць гаворкі Выганаўскага Палесся больш глыбока і дэталёва, г.зн. скласці дыялекталагічны мікраатлас рэгіёна. Пры гэтым аб'ектам вывучэння сталі гаворкі амаль усіх населеных пунктаў. Лінгвагеаграфічнае даследаванне гаворак Выганаўскага Палесся праводзілася намі на працягу 1985–2013 гг. Фактычны матэрыял збіраўся пераважна ў паўднёвай частцы Івацэвіцкага (Целяханшчыне) і на сумежнай тэрыторыі Пінскага, Ганцавіцкага, а таксама Бярозаўскага, Драгічынскага, Кобрынскага і Столінскага раёнаў Брэсцкай вобласці, Жыткавіцкага і Клецкага раёнаў адпаведна Гомельскай і Мінскай абласцей. У агульнай колькасці абследаваны гаворкі 34 населеных пунктаў, з іх у Івацэвіцкім – 23, Пінскім – 4, Драгічынскім – 2, у Ганцавіцкім, Кобрынскім, Столінскім, Клецкім і Жыткавіцкім раёнах – па адным населеным пункце. Як правіла, апытваліся інфарматары ад 40 да 90 гадоў, якія з'яўляліся карэннымі жыхарамі (аўтахтонамі) канкрэтнага населенага пункта. Праграма даследавання ўключала 117 пытанняў, з іх 38 – па фанетыцы, 33 – па марфалогіі і 46 – па лексіцы.

## Гаворкі Выганаўскага Палесся і наваколляў

Усяго складзена 253 карты, у тым ліку ўступныя – 12 (агульныя – 4, гістарычныя – 8), лінгвістычныя – 142 (фанетычныя – 56, марфалагічныя – 33, лексічныя – 53), ізаглосныя – 99. Уступныя і лінгвістычныя карты разам з дадатковымі матэрыяламі першы раз апублікаваны ў атласе “Гаворкі Выганаўскага Палесся” [9]. Сетка атласа складаецца з дзвюх частак: асноўнай (26 населеных пунктаў) і дадатковай (8 населеных пунктаў). У лінгвістычным атласе “Гаворкі Выганаўскага Палесся” ўсяго 154 карты, з іх 12 уступныя (№ I–XII) і 142 лінгвістычныя. У 2013 г. апублікаваны “Атлас гаворак Выганаўскага Палесся” [10]. У параўнанні з папярэднім выданнем у яго ўнесены невялікія змены, а таксама дабаўлены раздзелы “З водзываў на атлас”, “З гісторыі Выганаўскага Палесся” (дадатковыя матэрыялы), “Тыпалогія ізаглос” (99 карт).

Паводле праведзеных даследаванняў, у гаворках рэгіёна назіраюцца значныя адрозненні на ўзроўні фанетыкі, марфалогіі і лексікі. Таму яны падзяляюцца шматлікімі ізаглосамі, якія аб'яднаны ў пучкі. Апошнія ў сваю чаргу на тэрыторыі Выганаўскага Палесся ўтвараюць чатыры асноўныя групы (серыі):

*паўночную, паўднёвую, цэнтральную* і *лакальныя* пучкі ізаглос [10, карты №№ 139–237].

Заўважым, што пучкі ізаглос паўночнай, паўднёвай і цэнтральнай груп у большай ці меншай ступені пашыраюцца на ўсе ці амаль на ўсе гаворкі Выганаўскага Палесся. Таму яны часта аб'ядноўваюць дзве і болей дыялектных адзінак. У той жа час нярэдка часткі двух і болей пучкоў зліваюцца. Дыялектныя адзінкі характарызуюцца агульнасцю на ўсіх узроўнях мовы (фанетыка, марфалогія, лексіка). Таму пучкі ізаглос не заўсёды з'яўляюцца межамі паміж групамі гаворак. Аднак на падставе пучкоў ізаглос такія межы ўстаноўлены. Пры гэтым вельмі дакладна, паколькі ў вывучаемым рэгіёне даследаваны амаль усе вёскі. Унутранае адзінства асобных груп (падгруп) установлена на багатым фактычным матэрыяле, які дае "Атлас гаворак Выганаўскага Палесся" і лінгвістычны атлас "Гаворкі Выганаўскага Палесся".

Такім чынам, паводле праведзеных даследаванняў на тэрыторыі Выганаўскага Палесся вылучаюцца наступныя дыялектныя адзінкі. На паўночным захадзе рэгіёна бытуюць гродзенска-баранавіцкія (панямонскія) гаворкі. На асноўнай частцы яго тэрыторыі (цэнтральная частка) пашыраны паўночнабрэсцкія гаворкі, пераважна іх цэнтральнацеляханская падгрупа (унутры яе усходне – і заходнецеляханская мікрападгрупы), у цэнтры – гаворка мястэчка Целяханы. На паўднёвы захад і паўднёвы ўсход ад названых гаворак бытуюць адпаведна паўднёвацеляханскія і валішчанска-аброўскія гаворкі, на поўдні рэгіёна – сярэднезагародская гаворка в. Сакалоўка (гл. карту). Акрамя дыялектных груп і падгруп, пры чляненні гаворак пэўнай мовы або рэгіёна выкарыстоўваюцца такія катэгорыі, як дыялектная зона і дыялектная мікразона. У межах Выганаўскага Палесся вылучана целяханская мікразона, якая ўключае цэнтральнацеляханскую падгрупу паўночнабрэсцкіх гаворак і паўднёвацеляханскую групу гаворак.

Разгледзім асноўныя фанетычныя і марфалагічныя адметнасці гэтых дыялектных адзінак.

**Гродзенска-баранавіцкім гаворкам** характэрны наступныя асаблівасці: васьміфанемны склад галосных гукаў – [*і*], [*ы*], [*ê*], [*е*(*э*)], [*а*], [*о*], [*о̂*], [*у*]; галосны [*а*] на месцы ***о** ў пераднаціскных складах пасля цвёрдых зычных /няпоўнае недысімілятыўнае аканне/ (*галава́, даро́га, каро́ва, малако́, се́но, ле́то, садо́к, трава́* і інш.); пераважна галосныя [*о*], [*о̂*] на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам (*воз, нос, стол, конь*; *во̂з, но̂с, сто̂л, ко̂нь* іінш.); пераважна галосныя [*е*], [*ê*] на месцы націскнога ***ѣ** (лес, се́но, хлеп; *ле̂с, се̂но, хлêп* і інш.); галосны [*ы*] пасля зычнага [*б*] у словаформах *быў, была́, было́, былі́*; мяккія губныя і пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***е**, ***ѣ**, ***і** (*вясна́, мёд, бе́раг, ве́чар, да мяне́, пе́ршы, бяда́, мяшо́к, дзянёк, зямля́, сяло́, по́ле, мі́ска, рабі́ць, лі́па, зіма́, хадзі́ць*); мяккія і паўмяккія ***д**, ***т** перайшлі ў палатальныя [*дз"*], [*ц"*] (*дз"ен', ц"ап'ёр, хадз"іц", ц"іхо, дз"ед, ц"ен', хо́дз"іц", хо́дз"ац"*); мяккія заднеязычныя

ў гістарычных спалучэннях ***гы**, ***кы**, ***хы** (*до́ўгі, каро́ткі, ці́хі*); толькі цвёрды зычны ***р** (*град, грэх, пара́дак, парэ́заў, рэ́чка, каро́ўка* і інш.); толькі цвёрдыя шыпячыя (*жар, жы́то, на мяжы́, ша́пка* і інш.); гістарычны мяккі ***ц** паслядоўна ацвярдзеў (*маладзі́ца, хло́пцы, ца́цка, цэ́ўка, цэп*); пераважна аглушэнне звонкіх у канцавым становішчы і ў сярэдзіне слова перад глухімі (*вос, дуп, ка́ска, зага́тка*); паўгалосны [*ў*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы (*пра́ўда, до́ўгі, купі́ў*); канчаткі *-ём* (*-ом*) назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне (*канём, рублём, нажо́м, яйцо́м*); формы асабова-ўказальных займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *ён, яна́, яно́, яны́*; формы інфінітыва з асновай на галосны з суфіксам *-ць* (*хадзі́ць, рабі́ць, спаць*); формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве з постфіксам *-ца* (*бра́цца, зва́цца, рабі́цца, умыва́цца*); формы інфінітыва з асновай на [*к*] (*пячы́, сячы́*) і інш.

**Цэнтральнацеляханскай падгрупе гаворак** уласцівы наступныя адметнасці: сяміфанемны склад галосных гукаў – [*і*], [*ы*], [*е*(*э*)], [*ê*(*э*⊥)], [*а*], [*о*], [*у*]; захаванне ***о** ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ (*голова́, доро́га, коро́ва, молоко́, се́но, се́но, ле́то, ле́то, садо́к, трава́* і інш.); галосны [*э*⊥(*ê*)] на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам (*вэ*⊥*з, вêз, нэ*⊥*с, стэ*⊥*л, кэ*⊥*нь, кêнь* і інш.); пераважна галосны [*ê*] на месцы націскнога ***ћ** (*ле́с, се́но, сне́г* і інш.); пераважна галосны [*у*] пасля зычнага [*б*] у словаформах *быў, была́, было́, былі́* (*був /буў/, була́, було́, булі́*); пераважна цвёрдыя губныя перад рэфлексамі ***е** (ва ўсіх пазіцыях), ***ћ** (у ненаціскных складах) (*вэсна́, васна́, мэд, бэ́рог, вэ́чор, до мэне́, до мане́, пэ́ршы, бэда́, бада́, мэшо́к, машо́к*); мяккія пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***е** (*дзенёк /дз$^{э}$енёк, денёк/, земля́, село́, по́ле*); мяккія губныя і пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***і** (*мі́ска, робі́ці, /робі́ць, робі́ц$^{т}$і, робі́ті/, лі́па, зіма́, ходзі́ці, / ходзі́ць, ходз$^{д}$і́ц$^{т}$і, ході́ті/*); мяккія і паўмяккія ***д**, ***т** перайшлі пераважна ў палаталізаваныя [*дз'*], [*ц'*], зрэдку – у мяккія [*дз$^{д}$'*], [*ц$^{т}$'*]: (*дз'ен', ц'е́пэр, ц'е́пэра /ц'е́пэрака/, ц'еп'ёр, ходз'і́ц'і, ц'і́хо, дз'ед, ц'ен'; дз$^{д}$'ен', ц$^{т}$'е́пэр, ходз$^{д}$'і́ц$^{т}$'і, ц$^{т}$'і́хо, дз$^{д}$'ед, ц$^{т}$'ен'*); на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку мяккі ***т** пераважна ацвярдзеў (*хо́дз'іт, хо́дз'ат /хо́дз$^{д}$'іт, хо́дз$^{д}$'ат, хо́д'іт, хо́д'ат/*); мяккія заднеязычныя ў гістарычных спалучэннях ***гы**, ***кы**, ***хы** (*до́вгі / до́ўгі/, коро́ткі, ці́хі /цті́хі, ті́хі/*); пераважна цвёрды і паўмяккі зычны ***р**, зрэдку мяккі ***р** захаваўся (*град, грэх, пора́док порэ́зав, /порэ́заў/, рэ́чка, корэ́вка; гр'ад, гр'эх, пор'а́док, пор'э́зав, р'э́чка, кор'э́вка* і інш.; *грех, поря́док, поре́зав, ре́чка*); пераважна цвёрдыя шыпячыя (*жар, жы́то, на мэжэ́ /на межэ́/, ша́пка* і інш.); толькі цвёрды гістарычны мяккі ***ц** (*молодзі́ца /молодздіца, молоді́ца/, хло́пцы, ца́цка, цэ́вка /цэ́ўка/, цэп*); пераважна захаванне звонкіх зычных у канцавым становішчы і ў сярэдзіне слова перад глухімі (*вэ*⊥*з, ве*⊥*з, дуб, ка́зка, ска́зка, зага́дка*); пераважна губна-губны [*w*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы (*пра́wда, до́wгі, купі́w*); пераважна канчаткі *-ем* (*-эм*)

назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне (*конéм, рублéм, ножэ́м, ейцэ́м*); формы асабова-ўказальных займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *вэ⊥н, вêн, вона́, воно́, воны́*; формы інфінітыва з асновай на галосны пераважна з суфіксам -*ці*, зрэдку -*ц^т^і* (*ходзі́ці, робі́ці, спа́ці; ходзд'і́ц^т^і, робі́ц^т^і, спа́ц^т^і*); формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве пераважна з постфіксам -*са* (-*с*) (*бра́ціса /бра́ц^т^іса, бра́тіса, бра́ціс/, зва́ціса /зва́ц^т^іса, зва́тіса, зва́ціс/, мы́ціса, мы́ціс, робі́ціса /робі́ц^т^іса, робі́тіса, робі́ціс/, умыва́ціса, /умыва́ц^т^іса, умыва́тіса, умыва́ціс/*); формы інфінітыва з асновай на [к] (*пэкці́, пéкці; пэкцé /пекцé, пэкц^т^é, пэктé/; сéкці /сéкц^т^і, сéкті/*) і інш.

Шэраг спецыфічных асаблівасцей цэнтральнацеляханскай падгрупы паўночнабрэсцкіх гаворак утвараюць дзве дыялектныя мікрападгрупы: у с х о д н е ц е л я х а н с к у ю і з а х о д н е ц е л я х а н с к у ю. Спецыфічнымі адметнасцямі ўсходнецеляханскай мікрападгрупы з'яўляюцца галосны [*і*] на месцы ***ы** ў націскным і першым пераднаціскным складзе пасля губных зычных (*бік, ві, ві́пі, вісо́ко, ві́сыпав /ві́сыпаў/, грыбі́, мі, міш, помі́ю, піл* і інш.); галосны [*ы·*] на месцы націскнога ***ы** ў словах тыпу *сын, валы́, ры́ба, дым* (*сы·н, волы́·, ры́·ба*); галосны [*і*] на месцы ***о** ў прыназоўніку *пад* (*під*); мяккія губныя перад рэфлексамі ***е**, ***h** (*весна́, мед, бéрог, вéчор, до менé, пéршы, беда́, мешо́к*); мяккія губныя і заднеязычныя перад канчаткам -*ей* у назоўніках жаночага роду множнага ліку роднага склону (*бабéй, головéй, ямéй, дорогéй, стрехéй*); мяккія заднеязычныя перад [*е*] (*до́вгее, до́вге, коро́ткее, коро́тке, ці́хее /ці́хе/*); мяккія губныя і заднеязычныя перад рэфлексамі ***о** ў новых закрытых складах пад націскам (*вêз, кêнь*); наяўнасць паўмяккага зычнага ***р** (*гр'а́д, гр'э́х, пор'а́док, пор'э́зав, р'э́чка* і інш.); уласна-асабовы займеннік другой асобы множнага ліку *ві* і інш. Спецыфічнымі асаблівасцямі заходнецеляханскай мікрападгрупы з'яўляюцца галосны [*а*] на месцы ***е**, ***h** ў першым пераднаціскным складзе пасля цвёрдых губных (*васна́, бада́, машо́к*); галосны [*ы^у^*]3 пасля зычнага [*б*] у словаформах *быў, была́, было́, былі́* (*бы^у^в, бы^у^ла́, бы^у^ло́, бы^у^лі́*); палаталізаваны [*ц'*] на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку (*хо́дз'іц', хо́дз'ац'*); наяўнасць мяккіх і паўмяккіх шыпячых (*жяр, на мэжé, на межé, шя́пка; ж'и́то*); частковае аглушэнне звонкіх зычных у сярэдзіне слова перад глухімі (*ка́з^с^ка, ска́з^с^ка, зага́д^т^ка*); адпадзенне пачатковага гука ў слове *ану́ча* (*ну́ча*); канчатак -*ямі* назоўніка *гру́дзі* ў творным склоне (*грудзя́мі*) і інш.

**Паўднёвацеляханскім гаворкам** характэрны наступныя адметнасці: сяміфанемны склад галосных гукаў – [*і*], [*ы*], [*е*(*э*)], [*ê*(*э⊥*)], [*а*], [*о*], [*у*]; галосны [*э⊥*] на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам (*вэ⊥з, нэ⊥с, стэ⊥л, кэ⊥нь* і інш.); галосны [*ê*] на месцы націскнога ***h** (*лêс, сêно, снêг* і інш.); захаванне ***о** ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ (*голова́, доро́га, коро́ва, молоко́, сêно, лêто, садо́к, трава́* і інш.); цвёрдыя губныя перад рэфлексам ***е** /

ва ўсіх пазіцыях/, *ѣ /у ненацiскных складах/ (*вэсна́, мэд, бэ́рог, вэ́чор, до мэнэ́, пэ́ршы, бэда́, мэшо́к*); цвёрдыя пярэднеязычныя (акрамя *л) перад рэфлексамі *е (*дэнь, дэнёк, зэмля́, сэло́, тэпэ́р; по́ле*); мяккія губныя і пярэднеязычныя перад рэфлексамі *і (*міска, робі́ті, ліпа, зіма́, ході́ті*); адсутнасць дзекання-цекання (*ход'іт'і, т'іхо, д'ед, т'ен'*); цвёрды [т], этымалагічны мяккі [т'] на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку (*хо́д'іт, хо́д'ат; хо́д'іт', хо́д'ат'*); мяккія заднеязычныя у гістарычных спалучэннях *гы, *кы, *хы (*до́вгі, коро́ткі, ті́хі*); толькі цвёрды зычны *р (*град, грэх, пора́док, порэ́зав, рэ́чка, корэ⊥вка* і інш.); толькі цвёрдыя шыпячыя (*жар, жыто, на мэжэ́, ша́пка*); толькі цвёрды гістарычны мяккі *ц (*молоді́ца, хло́пцы, ца́цка, цэ́вка, цэп*); захаванне, аглушэнне, частковае аглушэнне звонкіх зычных у канцавым становішчы і ў сярэдзіне слова перад глухімі (*вэ⊥з, дуб, ка́зка, зага́дка; вэ⊥с, дуп, ка́ска, зага́тка; вэ⊥зс, дубп, ска́зска, зага́д$^т$ка*); губна-губны [w] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы (*пра́wда, до́wгі, купі́w*); канчаткі *-ем* (*-эм*) назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне (*коне́м, рубле́м, ножэ́м, ейцэ́м*); формы асабова-ўказальных займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *вэ⊥н, вона́, воно́, воны́*; формы інфінітыва з асновай на галосны з фанематычным варыянтам суфікса *-ці -ті* (*ході́ті, робі́ті, спа́ті*); формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве з постфіксам *-са* (*бра́тіса, зва́тіса, робі́тіса, умыва́тіса*); формы інфінітыва з асновай на [к] (*пэкте́; се́кті, сэкті́*) і інш.

**Гаворцы мястэчка Целяханы** ўласцівы наступныя асаблівасці: васьміфанемны склад галосных гукаў – [*і*], [*ы*], [*е*(*э*)], [*ê*], [*а*], [*о*], [*ô*], [*у*]; галосныя [*о*], [*ô*] на месцы *о ў новых закрытых складах пад націскам (*воз, нос, стол, конь; вôз, нôс, стôл, кôнь* і інш.); галосныя [*е*], [*ê*] на месцы націскнога *ѣ (*лес, се́но, снег; лêс, сêно, снêг* і інш.); захаванне *о ў ненацiскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ (*голова́, доро́га, коро́ва, молоко́, се́но, сếно, ле́то, лếто, садо́к, трава́* і інш.); цвёрдыя губныя перад рэфлексамі *е /ва ўсіх пазіцыях/, *ѣ /у ненацiскных складах/ (*вэсна́, мэд, бэ́рог, вэ́чор, до мэне́, пэ́ршы, бэда́, мэшо́к*); мяккія пярэднеязычныя перад рэфлексамі *е (*денёк земля́, село́, по́ле*); мяккія губныя і пярэднеязычныя перад рэфлексамі *і (*міска, робі́ті, ліпа, зіма́, ході́ті*); адсутнасць дзекання-цекання (*д'ен', т'епэр, ход'іт'і, т'іхо, д'ед, т'ен'*); цвёрды [*т*] на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку (*хо́д'іт, хо́д'ат*); мяккія заднеязычныя у гістарычных спалучэннях *гы, *кы, *хы (*до́вгі, коро́ткі, ті́хі*); наяўнасць паўмяккага зычнага *р (*гр'ад, гр'эх, пор'а́док, пор'э́зав, р'э́чка* і інш.); толькі цвёрдыя шыпячыя (*жар, жыто, на мэжэ́, ша́пка*); толькі цвёрды гістарычны мяккі *ц (*молоді́ца, хло́пцы, ца́цка, цэ́вка, цэп*); захаванне або аглушэнне звонкіх зычных у канцавым становішчы (*вôз, дуб; вос, дуп*); аглушэнне звонкіх зычных у сярэдзіне слова перад глухімі (*ска́ска, зага́тка*); губна-губны [*w*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў

канцавым становішчы (*práwда, dówгi, купíw*); канчаткі *-ем* (*-эм*), *-ём* назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне (*конéм, ножэ́м, ейцэ́м; конём, рублём*); формы асабова-ўказальных займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *вôн, воná, вонó, воны́; он, оná, онó, оны́*; формы інфінітыва з асновай на галосны з фанематычным варыянтам суфікса *-цi -тi* (*ходíтi, робíтi, спáтi*); формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве з постфіксам *-са* (*брáтiса, звáтiса, мы́тiса, робíтiса, умывáтiса*); формы інфінітыва з асновай на [к] (*пэкте́, пэкце́; се́ктi, се́кцi*) і інш.

**Валішчанска-аброўскім гаворкам** характэрны наступныя адметнасці: васьміфанемны склад галосных гукаў – [*i*], [*ы*], [*е*(*э*)], [*ê*], [*a*], [*o*], [*ô*], [*y*]; галосны [*ô*] на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам (*вôз, но⊥с, стôл, кôнь* і інш.); галосныя [*ê*], [*ы*ᵊ] на месцы націскнога ***ѣ** (*лêс, сêно, снêг; л'ы*ᵊ*с, с'ы*ᵊ*но, сны*ᵊ*г* і інш.); захаванне ***о** ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ (*головá, дорóга, корóва, молокó, сêно, лêто, с'ы*ᵊ*но, л'ы*ᵊ*то, садóк, травá* і інш.); вымаўленне галоснага [*i*] або захаванне ***ы** ў націскным і першым пераднаціскным складзе пасля губных зычных (*бiк, вi, вíпi, вiсóко, вíсыпав, грыбí, мi, мiш, помíю, пiл; бык, вы, вы́пi, высóко, вы́сыпав, грыбы́, мы, мыш, помы́ю, пыл* і інш.); галосныя [*и*], [*ы·*] на месцы націскнога ***ы** ў словах тыпу сын, валы́, рыба, дым (*с'ин, вол'и́, р'и́ба; сы·н, волы́·, ры́·ба*); цвёрдыя губныя перад ***е** /ва ўсіх пазіцыях/, ***ѣ** /у ненаціскных складах/ (*вэснá, вы*ᵊ*снá, мэд, бэ́рог, вэ́чор /вэ*ᵊ*чор/*[6], *до мэнэ́, пэ́ршы, бэдá, бы*ᵊ*дá, мэшóк, мы*ᵊ*шóк*); паўмяккія і мяккія губныя перад рэфлексамі ***i** (***и**) (*м'и́ска, роб'и́т'и; мíска, робíты*); цвёрдыя і паўмяккія пярэднеязычныя (аднак ***л** паўмяккі і мяккі) перад рэфлексамі ***е**, ***i** (***и**) (*дэнь, дэнёк, ды*ᵊ*нёк, зэмля́, сэлó, тэпэ́р, ты*ᵊ*пэ́р, зымá, ходы́ты, ты́хо; д'энёк, з'эмля́, з'ы*ᵊ*мля́, с'элó, с'ы*ᵊ*лó, т'эпэ́р, з'имá, ход'и́т'и, т'и́хо, пóл'э, л'и́па; пóле, лíпа*); мяккія [*д'*], [*т'*], цвёрдыя [*д*], [*т*] перад рэфлексамі націскнога ***ѣ** (*д'ед, т'ен', ды*ᵊ*д, тыэн'*); мяккі [*т'*], цвёрды [*т*] на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку (*хóд'ит', хóдыт', хóд'ат'; хóд'ит, хóд'ат*); паўмяккія і мяккія заднеязычныя у гістарычных спалучэннях ***гы**, ***кы**, ***хы** (*дóвг'и, корóтк'и, т'и́х'и; дóвгi, корóткi, ты́хi*); наяўнасць паўмяккага або толькі цвёрды зычны ***р** (*гр'ад, гр'эх, пор'áдок, пор'э́зав, р'э́чка, кор'э⊥вка; град, грэх, порáдок, порэ́зав, рэ́чка, корôвка, корôўка* і інш.); наяўнасць паўмяккіх або толькі цвёрдыя шыпячыя (*ж'и́то, на мы*ᵊ*ж'и́; жар, жытó, на мэжэ́, шáпка*); наяўнасць паўмяккага і пазіцыйна абмежаванага гістарычнага мяккага ***ц** (*хлóпц'и; цíвка*); захаванне звонкіх зычных у канцавым становішчы (*вôз, воз, дуб*); пераважна аглушэнне, часам захаванне звонкіх зычных у сярэдзіне слова перад глухімі (*кáска, скáска, загáтка; загáдка*); губна-губны [*w*], губна-зубны [*v*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы (*práwда, dówгi, dówг'и, купíw, куп'и́w; прávда, dóvг'и, куп'и́v*); канчаткі *-ем* (*-эм*), *-ём* (*-ом*) назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне (*конéм,*

*рубле́м, ножэ́м, ейцэ́м, яйцэ́м*; *конём, рублём, ножо́м*); формы займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *во́н, вон, вона́, воно́, воны́*; формы інфінітыва з асновай на галосны з фанематычнымі варыянтамі суфікса *-ці -т'и*, *-ты* (*ход'и́т'и, роб'и́т'и, спа́т'и*; *ходы́ты, робы́ты, робі́ты, спа́ты*); формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве з постфіксам *-са* (*бра́т'иса, бра́тыса, зва́т'иса, зва́тыса, роб'и́т'иса, робі́тыса, ум'ива́т'иса, умыва́тыса*); формы інфінітыва з асновай на [*к*] (*пэкте́, сэкте́*; *пэкт'и́, се̂кт'и, сэкт'и́*) і інш.

**Сярэднезагародскай гаворцы в. Сакалоўка** уласцівы наступныя асаблівасці: шасціфанемны склад галосных гукаў – [*і*], [*ы*], [*е*(*э*)], [*а*], [*о*], [*у*]; галосны [*ы*] на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам (*выз, ныс, стыл, кынь* і інш.); галосны [*і*] на месцы націскнога ***ѣ** (*ліс, сіно, сніг* і інш.); захаванне ***о** ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ (*голова́, дорга, коро́ва, молоко́, сі́но, лі́то, садо́к, трава́* і інш.); галосны [*ы·*] на месцы націскнога ***ы** ў словах тыпу *сын, валы́, рыба, дым* (*сы·н, волы́·, ры́·ба*); цвёрдыя губныя перад рэфлексамі ***е** /ва ўсіх пазіцыях/, ***ѣ** /у ненаціскных складах/, ***і** (*вэсна́, мэд, бэ́рог, вэ́чор до мэнэ́, пэ́ршы, бэда́, мэшо́к, мыска, робы́ты*); цвёрдыя пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***е**, ***і** (*дэнь, дэнё́к, зэмля́, сэло́, тэпэ́р, по́лэ, лыпа, зыма́, ходы́ты, тыхо*); мяккія [*д'*], [*т'*] перад рэфлексамі націскнога ***ѣ** і на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку (*д'ід, т'ін'*; *хо́дыт', хо́д'ат'*); захаванне гістарычных спалучэнняў ***гы**, ***кы**, ***хы** (*до́вгы, коро́ткы, ты́хы*); наяўнасць мяккага і паўмяккага зычнага ***р** (*гріх, порі́зав, рі́чка, на двор'и́* і інш.); толькі цвёрдыя шыпячыя (*жар, жыто́, на мэ́жэ, ша́пка*); наяўнасць пазіцыйна абмежаванага этымалагічнага мяккага ***ц** (*ці́вка*); захаванне звонкіх зычных у канцавым становішчы і ў сярэдзіне слова перад глухімі (*выз, дуб, ка́зка, зага́дка*); губна-зубны [*v*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы (*пра́vда, до́vгы, купыv*); канчаткі *-ем* (*-эм*), *-ом* назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне (*коне́м, рубле́м, яйцэ́м*; *ножо́м, яйцо́м*); формы займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *вын, вона́, воно́, воны́*; формы інфінітыва з асновай на галосны з фанематычным варыянтам суфікса *-ці -ты* (*ходы́ты, робы́ты, спа́ты*); формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве з постфіксам *-са* (*бра́тыса, зва́тыса, мытыса, робы́тыса*); формы інфінітыва з асновай на [*к*] (*пэкты́, сэкты́*) і інш.

Для **целяханскай дыялектнай мікразоны** характэрны наступныя адметнасці: рэфлекс ***о** > [э⊥(*ê*)] у новых закрытых складах пад націскам (*вэ⊥з, вêз, нэ⊥с, стэ⊥л, кэ⊥нь, кêнь*); галосныя [*е*], [*э*] на месцы ***ę** ў пераднаціскным і паслянаціскным складзе ў лексемах *глядзе́ў, злякаўся, зляка́цца, за́яц, па́мяць* (*гледзе́в, гледе́в /гледзе́ў, гледз*$^{д}$*е́в/, злека́вса, злека́цца, злека́ціса, злека́тіса, за́ец, па́мэць, па́мець, па́мэть /па́мэц*$^{т}$*ь/*); пераважна цвёрды [*т*] на канцы дзеясловаў

у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку (*хóдз'ім, хóдз'ам /хóдз$^{д}$'ім, хóдз$^{д}$'ам/ хóд'ім, хóд'ам*); пераважна губна-губны [*w*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы (*пра́wда, дówгі, купі́w*); формы інфінітыва з асновай на галосны з суфіксамі -*ці*, -*ті* (*ходзі́ці, робі́ці, спа́ці*; *ході́ті, робі́ті, спа́ті*) і інш.

Такім чынам, на аснове сабранага фактычнага матэрыялу ўпершыню ў беларускай лінгвістыцы праведзены комплексны лінгвагеаграфічны аналіз дыялектнай мовы Выганаўскага Палесся, якое знаходзіцца ў зоне міждыялектных кантактаў і ўзаемаўплываў гаворак Берасцейска-Пінскага Палесся і Панямоння. Гэта дазволіла вызначыць характэрныя асаблівасці гаворак на ўзроўні фанетыкі, марфалогіі і лексікі і стварыць рэгіянальныя дыялекталагічныя атласы; пацвердзіць правамернасць вылучаных раней дыялектных адзінак, удакладніць іх межы; выдзеліць целяханскую дыялектную мікразону; акрэсліць межы цэнтральнацеляханскай падгрупы паўночнабрэсцкіх гаворак і вылучыць ўнутры яе ўсходне – і заходнецеляханскую мікрападгрупы; выявіць інавацыйныя з'явы і іх пашырэнне на тэрыторыі даследуемага рэгіёна.

## Бібліяграфія


1. *Нарысы па беларускай дыялекталогіі* : вучэб. дапам. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; пад рэд. Р.І. Аванесава ; [рэдкал.: М.В. Бірыла, І.М. Гайдукевіч, Ю.Ф. Мацкевіч]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1964. – 415 с.
2. *Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак* : атлас / Р.І. Аванесаў [і інш.] ; Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; пад рэд. Р.І. Аванесава, К.К. Атраховіча (Крапівы), Ю.Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 112 с.
3. Блінава Э.Д., *Беларуская дыялекталогія* : вучэб. дапам. / Э.Д. Блінава, Е.С. Мяцельская. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1980. – 303 с.
4. Вайтовіч Н.Т., *Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі* / Н.Т. Вайтовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 220 с.
5. Клімчук Ф.Д., *Гаворкі Заходняга Палесся: фанетычны нарыс* / Ф.Д. Клімчук ; Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; [рэд. М.І. Талстой]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 126 с.
6. Крывіцкі А.А., *Дыялекталогія беларускай мовы* : дапам. для філал. спецыяльнасцей ВНУ / А.А. Крывіцкі. – Мінск : Выш. шк., 2003. – 293 с.
7. Босак А.А., *Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя* / А.А. Босак, В.М. Босак. – Мінск : [б. в.], 2007. – 130 с.
8. Клімчук Ф.Д., *Гаворкі Берасцейска-Пінскага Палесся і Падляшша як вынік гістарычнага развіцця* / Ф.Д. Клімчук // Pogranicze. – 2003. – Т. 4. – С. 245–256. – Прил. карты 1, 2.
9. Самуйлік Я. Р., *Гаворкі Выганаўскага Палесся* : лінгвіст. атлас для студэнтаў філал. фак. ун-та / Я. Р. Самуйлік ; Брэсц. дзярж. ун-т. – Брэст : БрДУ, 2009. – 199 с.
10. Самуйлік Я.Р., *Атлас гаворак Выганаўскага Палесся* / Я.Р. Самуйлік ; Брэсц. дзярж. тэхн. ун-т. – Брэст : БрДТУ, 2013. – 322 с.